PolotskSU



**УДК 72.04+726.5.052**

# ДЗВЕРЫ ЦАРКВЫ СВ. ПЯТРА І ПАЎЛА І КАСЦЁЛА СВ. ТРОІЦЫ Ў РУЖАНАХ

***Ю.Т. Шэстак***
Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт, Рэспубліка Беларусь
e-mail: shestak@bntu.by

*Артыкул прысвечаны апісанню і даследаванню дзвярэй двух храмаў у горадзе Ружаны Брэсцкай вобласці. Гэта драўляныя і металічныя вырабы другой паловы XVIII ст., а таксама ўнікальнае дзвярное запаўненне 1669 г. з аздобай у выглядзе выразаных на паверхні тэкста і сімвалаў рэлігійнага характару.*
***Ключавыя словы**: дзверы, металічныя дзверы, драўляныя дзверы, дзвярное запаўненне, рыма-каталіцкі касцёл, праваслаўная царква, уніяцкая царква, рэлігійны тэкст, фасад, дэкор, архітэктурная дэталь.*

# THE DOORS OF OF THE ST. PETER AND ST. PAUL CHURCH AND THE HOLY TRINITY CHURCH IN RUŹANY

***Y. Shestak***
Belarusian National Technical University, Republic of Belarus
e-mail: shestak@bntu.by

*The article describes the results of research done, for the first time, on the doors of two churches in the town of Ruźany (Ruzhany) situated in the Brest region of Belarus. Those are wooden and metal artefacts manufactured during the second half of the 18th century, as well as a unique example of a door assemblies from 1669 the surface of which is decorated with a carved religious text and symbols.*
***Keywords**: doors, metal doors, wooden doors, door assemblies, Roman-catholic church, orthodox church, uniate church, religious text, façade, decor, architectural detail.*

**Уводзіны.** Царква Святых Пятра і Паўла і касцёл Найсвяцейшай Троіцы ў Ружанах, што цягам доўгіх стагоддзяў былі прыватнаўласніцкім горадам, галоўнай рэзыдэнцыяй слыннага і ўплывовага магнацкага рода Сапегаў, – знакамітыя аб’екты гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі. Яны заслужана ўнесены ў шматлікія турыстычныя і гісторыка-культурныя даведнікі, дзе, ў асноўным, падаюцца агульныя звесткі, хаця цікавымі і нават унікальнымі з’яўляюцца асобныя часткі іх экстэр’ераў і інтэр’ераў. У любой пабудове дзверы, якія знаходзяцца на фасадзе, выступаюць выразным складнікам яе архітэктурнага рашэння. Размяшчэнне ўваходаў ва ўзроўні так званага партэра, то бок простага чалавечага позірку, надае асаблівую значнасць рашэнню запаўненняў і абрамленняў менавіта гэтай характэрнай дэталі для ўспрыняцця гледачом агульнага вобліку будынка. І чым рэпрэзэнтатыўней статус пабудовы, тым больш адказным элементам архітэктурна-кампазіцыйнага вырашэння служаць дзверы. Несумненна, што ў колішніх мястэчках храмы, якія супольна фармавалі цэнтр паселішча, былі аднымі з галоўных грамадскіх будынкаў свайго часу, да таго ж даступных агляду максімальна шырокага кола гледачоў, што накладала павышаную адказнасць на знешнія

PolotskSU



архітэктурныя характарыстыкі і дэталі. Менавіта такімі з’яўляліся хрысціянскія культавыя пабудовы ў Ружанах эпохі Сапегаў. У абодвух храмах сёння мы можам знайсці дзверы, выраблены менавіта ў той час. Яны даследуюцца ў гэтым артыкуле.

**Асноўная частка**. ***Троіцкі касцёл.*** Да 1617 г. у Ружанах быў збудаваны па фундацыі канцлера Льва Сапегі і кансекраваны біскупам Яўстахам Валовічам касцёл пад тытулам Найсвяцейшай Тройцы [1, с. 516], [2, с.30r]. Падчас Трынаццацігадовай вайны тут, у 1655–1660 гг., адбываліся пасяджэнні віленскай капітулы, рэліквіі якой разам з мошчамі Св. Казіміра захоўваліся тымчасам у ружанскім палацы. У 1661 г. у крыпце касцёла быў пахаваны віленскі біскуп Ян Караль Даўгяла-Завіша [3, с. 44–45]. Познерэнесансавая архітэктура храма мела ў далейшым выразны ўплыў на формаўтварэнне шэрагу іншых культавых будынкаў, фундаваных Сапегамі [4, с. 117]. Вайсковая канфедэрацыя шляхты і Паўночная вайна прынеслі Ружанам вялікія разбурэнні, аднак не вядома, ці быў пры гэтым пашкоджаны касцёл [5, с. 852–853]. Другая палова XVIII ст. стала часам новага росквіту горада. Гэта перыяд гаспадарання Казіміра і Хрысціны Масальскіх, а з 1774 г. – Аляксандра Міхала Сапегі, польнага гетмана, а потым вялікага канцлера літоўскага. Да 1779 г. завяршаецца трансфармацыя дэкаратыўнага аздаблення касцёла адпаведна станіславаўскаму класіцызму, троху раней дадаюцца дзве капліцы: Св. Барбары і Св. Крыжа. У 1850 г. храм рамантуецца. У 1895 г. у Ружанах адбыўся страшны пажар, які закрануў касцёл [6, с. 420]. Пасля аднаўлення, якое адбылося ў хуткім часе, храм больш ніколі не перапыняў сваю працу.

У нартэксе касцёла экспануюцца драўляныя дзверы, якія, некалі дэмантаваныя і замененыя на іншыя, доўгі час былі схаваны на гарышчы (мал.1). Гэты сталярны выраб прадстаўляе сабой унікальны ўзор дзвярэй XVII ст., якія аздоблены значным па плошчы рэлігійным тэкстам (агулам 81 радок) і дакладнай датай стварэння гэтага надпісу: ад дня Троіцы 1668 г. да 26 красавіка 1669 г. У артыкуле “Дзверы з надпісамі XVII ст. у Ружанах”, апублікаваным у “Беларускім гістарычным часопісе” ў верасні 2019 г., падрабязна разглядаецца гісторыя стварэння вырабу, ўсе яго характарыстыкі і адметнасці, тамсама дадзены з тлумачэннямі ўвесь пераклад тэксту з тагачаснай польскай на беларускую мову [7]. Былі зробленыя высновы, што хутчэй за ўсё, гэтыя дзверы некалі служылі або галоўнымі або наступнымі, што вялі непасрэдна ў малітоўную залю. Былі ўсталяваны пасля вайны 1654–1667 гг., а дэмантаваны ў другой палове XVIII ст. у ходзе тагачаснай грунтоўнай рэканструкцыі. Тэкст, які знаходзіцца ў ніжняй палове правага палатна звонку, займае плошчу 108х37 см., і ў цэлым прысвечаны Панне Марыі. Апрача таго, невядомы аўтар, імя якога засталося пад ніжняй абвязкай (верагодна, яно схавана наўмысна, або гэта адбылося пры рамонце 1698 г.) просіць нябёсныя сілы аб заступніцтве за сваю душу. У цэнтры адмыслова вылучанага і найбольш аздобленага верхняга фрагмента знаходзіцца выява ступні. Яна магла быць адначасова ўжываным у той час эталонам вымярэння даўжыні і сімвалам адбітку нагі Панны Марыі, пацалаваўшы які атрымлівалі для сябе працяглы адпуст у чыстцу [7]. Распашныя дзверы-брама памерам 281,5х177 см цалкам зроблены з драўніны, не маюць форткі. Псеўдафілянговы тып – характэрны для свайго часу [8, с. 273]. Дошкі палотнаў змацаваны 3 парамі шпонак. На тыльным баку ёсць сляды 2 пар стужкавых завесаў. На аверсе бачная абшыўка, якая імітуе філёнгі. Па цэнтру знаходзіцца дэкаратыўны элемент вышынёй 160 см, адметны разьбою, тыповаю ў XVII ст. [9, с. 188].

PolotskSU



Хутчэй за ўсё, старыя дзверы былі заменены падчас пераробкі аздаблення касцёла ў стылі класіцызм. На галоўным ўваходзе сёння знаходзяцца іншыя, датай з’яўлення якіх можна лічыць менавіта другую палову XVIII ст., час, калі прыдворным архітэктарам Сапегаў стаў Ян Самуэль Бекер. Гэты саксонскі архітэктар пакінуў пасля сябе вельмі значную спадчыну ў дойлідстве XVIII ст. на тэрыторыі Беларусі, прычым большая частка яго аб’ектаў захавалася менавіта ў Ружанах: каталіцкія касцёл і могілкавая капліца, царква з будынкам кляштара, карчма і раскошны княскі палац. Архітэктар і мастацтвазнаўца В. В. Калнін пераканаўча даводзіць, што “з'яўленне Бекера на Беларусі вызначаецца канцом 50-х – пачаткам 60-х гг. XVIII ст.” [10, с. 65, с. 72]. У гэты час памірае настаўнік Бекера, архітэктар Ян Зыгмунт Дэйбль, які да 1750 г. рэканструяваў палац у Ружанах. Верагодна, што праектам капліцы Св. Крыжа, зафундаванай у 1768 г., займаўся ўжо сам Бекер. Дакладна вядома, што ў 1771 г. архітэктар ужо працаваў у Ружанах. На тэрыторыі Беларусі ён пражыў з сям’ёю да самай смерці ў 1810 г., фактычна ўвесь свой творчы перыяд [10]. У любым разе, капліца Св. Барбары (пазначана ў інвентары 1786 г. як цалкам скончаная) і змяненне дэкаратыўнай касцёльнай аздобы ў стылі станіславаўскага класіцызму да 1779 г. дакладна належаць яго аўтарству. Адпаведна, можна сцвярджаць, што дзверы, якія захаваліся да сёння, таксама з’яўляліся адным з прыўнясенняў новай эстэтыкі, часткай аздобы храма аўтарства Бекера (мал. 2). Галоўны ўваход у храм адкрываецца ў першы ярус званіцы, які ў інвентары 1786 г. завецца крухтай, а ў інвентары 1813 г. – бабінцам: “*Уваходзячы да касцёла дзвярэй падвойных двое на завесах, з тых адныя да бабінца звычайнай сталярскай работы, замыкаюцца завалай, другія футраваныя, таксама да бабінца дзвярэй двое аднапольных сталярскай работы на завесах з за зашчэпкамі і з сярэдзіны заваламі замыканых*” [11], [12]. Крыніцы амаль даслоўна паўтараюць свае дадзеныя і можна сцвярджаць, што сённяшнія дзверы былі пастаўленыя да 1786 г. У гэтым годзе апісваецца мноства наяўных новаўвядзенняў у храме: пілястры і гзымсы, драўляныя хоры, пакрыццё падлогі двух тыпаў, уся тынкоўка і роспісы, амбон [11].




**Малюнак 1. – Дзверы 1669 г. Аверс. Рэверс. Накладны элемент: выгляд спераду, збоку**

PolotskSU



Двупольныя распашныя драўляныя парадныя дзверы зроблены глухімі, без форткі, з чвэрцямі з сярэдзіны. Габарыты: 312х174 см. Паводле канструкцыйнага тыпу з'яўляюцца дошкава-шпонкавымі на завесах, што бачна на рэверсе палотнаў: 3 дошкі кожнай палоўкі, пакладзеныя ў адзін пласт, злучаныя 3 шпонкамі. Мацуюцца на 2 парах стужкавых жалезных завесаў, прыбітых каванымі цвікамі. Гакі для петляў былі ўмураваны ў сцяну пры будаўніцтве званіцы ў 1604 г. Ад ранейапісаных дзверы адрозніваюцца кшталтам дэкаратыўнага аздаблення на парадным баку. У дадзеным выпадку ўжыта драўляная разьба, якая імітуе архітэктанічную форму – руст. 14 гарызантальных шэрагаў са швамі ў 2 см накладзены на дошкі палатна і прымацаваны расклёпанымі цвічкамі. На тыльным баку знаходзіцца шпінгалет ва ўсю даўжыню палатна. Некалі ў цэнтральнай частцы павінны быў быць адсутны на сёння замок, які аднак не згадваецца ў інвентарных апісаннях XVIII ст. На бакавых адхонах сцяны захаваліся адтуліны для завалы. Для дзвярэй, што расчыняюцца ўсярэдзіну (як у нашым выпадку), гэта быў вельмі просты і дзейсны спосаб перадухіліць пранікненне звонку. Такія ж адтуліны захаваліся пры бакавых уваходах першага яруса званіцы. Сёння ўсе дзверы пакрытыя цёмна-карычневай фарбай і без дадатковых даследванняў не з'яўляецца магчымым вызначыць гатунак выкарыстанай драўніны. Верагодна, гэта магла б быць лістоўніца, з якой быў зроблены прыблізна ў той жа час картуш на браме княскага палацу.




**Малюнак 2. – Галоўныя дзверы касцёла. Фота 2018 г., аверс, рэверс**

Увогуле ў дэкаратыўным аздабленні дзвярэй сустракаюцца самыя разнастайныя прыёмы, уласцівыя дамінуючаму мастацкаму стылю. Выкарыстаны ў дадзеным

PolotskSU



выпадку руст з’яўляецца адным з характэрных для класіцызма, запазычаных з антычнасці, тыпаў дэкора, які выкарыстоўвалі таксама ў часы барока. Звычайна імітацыя рустоўкі сустракалася на ніжніх ярусах муроў і выконвалася з тынку. Аднак, напрыклад, усё вонкавае аздабленне сцен сядзібнага дома ў Радзівілімонтах (цяпер – Красная Звязда ў Клецкім раёне Мінскай вобласці), пабудаванага ў 1780–1783 гг., было зроблена менавіта з драўлянай гарызантальна пакладзенай шалёўкі, якая сімвалізавала сабой руст. Такі ж дэкор выкарыстоўваўся для сядзібнага дому ў Бараціне Карэліцкага раёна (1780-я гг.), для афіцыны ў Янавічах Клецкага раёна (пачатак XIX ст.). Можна казаць пра мастацкі прыём імітацыі рустоўкі ў драўніне як пра тагачасны характэрны, але ўжываны радзей, чым у тынку. Пазней, у XIX ст., на дзвярах будзе сустракацца імітацыя французскага руста: гарызантальныя дошкі без вертыкальных швоў, як напрыклад, у могілкавай капліцы на парафіяльных могілках у Івянцы (1820 г.), у млыне ў в.Казлоўшчына Пастаўскага раёна (1859 г.), у капліцы Св. Казіміра ў Ружанах.



**Малюнак 3. – Бакавыя дзверы касцёла. Уваход у сакрыстыю. Фота 2018 г.**

Апрача галоўных цэнтральных дзвярэй у першы ярус званіцы злева і справа адкрываюцца бакавыя аднапольныя дзверы з памерамі 216х130 см, якія таксама ўзгадваюцца ў інвентарах 1786 і 1813 гг. [11], [12] Канструкцыйнае і дэкаратыўна-мастацкае вырашэнне гэтых дзвярэй – тое самае, што і для цэнтральнага ўваходу. Аверс гэтак жа аздоблены імітацыяй руста з троху спрошчанай раскладкай элементаў. Шырыня аднога “каменя” мае каля 55 см, шво складае 2–2,5 см. Правая частка зроблена з 5 дошак, вузейшых, чым тыя, што ўжыты на галоўных дзвярах. Меншая вышыня палатна дазволіла выкарыстаць толькі па 2 злучальныя шпонкі і стужкавыя завесы, прымацаваныя раскляпанымі цвікамі. У адтуліне на паверхні адхона захавалася драўляная завала. Дзверы з вуліцы ў правую сакрыстыю маюць аналагічныя дэкор і канструцыю, але адрозніваюцца наяўнасцю гарызантальнага рыгеля і фрамугі. У інвентары 1786 г. згадваюцца з навясным замком [11]. Усе чатыры экзэмпляра дзвярэй адносяцца да аднога тыпу і перыяду і ўяўляюць з сябе рэдкі выпадак добра захаванага камплекта XVIII ст.

PolotskSU



***Царква Св. Пятра і Паўла*** знаходзіцца на заходнім баку цэнтральнай плошчы Ружанаў. Вядомы з 1568 г. як драўляная царква грэцкага абраду канстантынопальскага патрыярхата. У 1639 г. па фундацыі маршалка дворнага літоўскага Казіміра Льва Сапегі пры ўжо ўніяцкай царкве засноўваецца базыльянскі манастыр. Але да канца не зразумела, быў першы манастырскі корпус пабудаваны тады, або ў 1675 г. У 1762 г. па фундацыі Хрысціны Розы Сапежыны, жонкі Казіміра Масальскага, пачалося будаўніцтва мураванага храма, якое аднак спынілася на 10 гадоў [1, с. 516]. Паводле адной версіі, аўтарам праекта аб пачатку быў архітэктар Ян Бекер, які ў 1772–1778 гг. працягнуў сваю працу і ўрэшце скончыў ўзвядзенне базыльянскай царквы, асвечанай у 1781 г. [10, с. 72]. Паводле іншага меркавання, будынак у гэтыя гады быў толькі рэканструяваны Бекерам [13, с. 195]. У 1834 г. быў зачынены базыльянскі манастыр, а ў 1839 г. храм афіцыйна перадалі ў падпарадкаванне да праваслаўнай царквы маскоўскага патрыярхата. Першы вядомы нам паўнавартасны вопіс у 1834 г. фіксуе выгляд больш адпаведны праекту Бекера, чым той, што дайшоў да сённяшніх часоў [14]. Абапіраючыся на гэтыя дадзеныя, можна казаць, што ружанская царква – гэта адзін з самых першых храмаў на нашай тэрыторыі, пабудаваных у стылі станіславаўскага, або барочнага, класіцызма. Падчас грунтоўнага рамонта, які распачаўся ў 1838 г., планавалася ў тым ліку замена званіцы, што, верагодна, магло быць рэалізавана часткова. У снежні 1845 г. выйшаў загад “Аб забеспячэнні прычта Ружанскай праваслаўнай царквы Слонімскага павета”, які значна палепшыў фінансавы стан гаспадаркі [15]. Падобна, што менавіта даты рэканструкцыі прынамсі гэтай часткі верхніх ярусаў званіцы адлюстраваны ў надпісах пад балюстрадамі: з 1844 (па іншай версіі, 1814) па 1845 гг. У 1875 г. царква моцна пацярпела ад пажару. Пасля яго давялося абнаўляць інтэр’ер, заадно да 1875 г. быў заменены дах завяршэнне званіцы [16]. Пажар 1895 г., ад якога пацярпела ўсё мястэчка, не закрануў царквы [17, с. 106–108]. Некаторае абнаўленне пасля падзеяў першай сусветнай вайны тычылася храмавага начыння і каменнай агароджы.




**Малюнак 4. – Дзверы ў апсідзе царквы: аверс, рэверс.**
**Дэкаратыўныя дэталі: кветка, ключавіна**

PolotskSU



На апсіднай частцы царквы можна ўбачыць металічныя дзверы, якія вядуць у крыпту пад будынкам. Гэта аднапольныя дзверы памерам 223х100 см. Маюць арачнае завяршэнне (мал. 4). Дзверы цэльнаметалічныя, што з’яўляецца даволі рэдкім выпадкам. Большасць вонкава падобных вырабаў мела драўляную аснову, абабітую металам. Цалкам зробленыя з жалеза дзверы абыходзіліся дорага і звычайна прызначаліся для храмаў з абарончымі элементамі, самым раннім зафіксаваным прыкладам чаго ў нашым рэгіёне можна лічыць уваход у Супрасльскую царкву Дабравешчання XVI ст. [18, с. 34–35] Палатно набранае з 10-ці металічных лістоў рознага памеру з абвязкай па контуры. Вонкавы дэкор адначасова служыць для замацавання гэтых кавалкаў паміж сабой: 14 вузкіх палос жалеза, пакладзены ўнахлёст і прыбіты кованымі цвікамі, чые галоўкі раскляпаны ў плешкі, а на перакрыжаваннях – аздоблены чатырохпялёсткавымі кветкамі. У цэнтры знаходзіцца самы выразны элемент упрыгожвання ў выглядзе кветкі 16х16 см, набранай з трох кавалкаў метала, паверхня якіх арнаментавана, як і дэкаратыўная накладка на ключавіну. Дзверы адчыняюцца ў памяшканне крыпты. З сярэдзіны можна бачыць дадатковае ўзмацненне: дзве перакрыжаваныя паласы з метала 35х20 мм. Для замыкання прадугледжана засаўка, якая звонку прыводзілася ў рух ключом. Дзверы навешаны на 3 стужкавыя завесы: 2 даўжэйшыя і 1 кароткую – і гакі, якія ўваходзяць другім канцом у сцяну. Умуроўка элементаў мацавання адбывалася паралельна з узвядзеннем будынка, і няма ніякіх слядоў, што гакі некалі адтуль вымаліся. Можна адзначыць, што такі тып вырабаў быў характэрны для доўгага перыяду, але паступова страціў папулярнасць з адыходам барока [8, с. 273]. Падобна, што дзверы, якія разглядаюцца, былі зроблены адразу ў 1762 г., чаму не супярэчыць апісаная вышэй гісторыя царквы, згодна якой храм не перажываў занадта разбуральных перыядаў.



**Малюнак 5. – Дзверы ў апсіду, выгляд звонку. Дзверы ў рызніцу: аверс, рэверс. Фота 2020 г.**

У сярэдзіне царквы, паміж алтарнай часткай малітоўнай залі і рызніцай, стаяць яшчэ адныя металічныя аднапольныя дзверы (мал. 5). Па ўсіх фармальных прыкметах (матэрыял, тып, дэкор) яны адносяцца да таго ж тыпу і перыяду, і выраблены тымі ж майстрамі, што і дзверы ў апсіднай частцы будынка. Маюць габарыты 190х130 см. Зроблены з 9 злучаных паміж сабою лістоў метала. Адрозніваюцца ад папярэдніх прастакутнай формай і наяўнасцю дадатковых скабяных вырабаў. Гэта колца-антаба

PolotskSU



з параднага боку (ад малітоўнай залы) і буйны накладны замок з ручкай з боку рызніцы. Можна адзначыць, што абедзве жалезныя дзверы Петрапаўлаўскай царквы спалучаюць у сабе функцыянальнасць са стрыманым, але выразным дэкаратыўным вырашэннем. Рамбавідныя краты перакрыжаваных палосаў жалеза і іншыя накладныя элементы ўтвараюць рытм і гульню светаценяў. Аздабленне абумоўленае з большага вонкавым праяўленнем канструкцыі, якая служыць мэтам дасягнення найбольшай трываласці і, адпаведна, умацаванасці ўнутранай прасторы за дзвярыма. Мастацкія прыёмы, такім чынам, грунтуюцца яшчэ на прынцыпах, закладзеных у ранейшыя эпохі, і застаюцца пазнакай трывалай прысутнасці спадчыны барока ў агульнай канве ранняга класіцызма.

**Заключэнне.** У храмах Ружанаў на сённяшні дзень можна ўбачыць адныя дзверы XVII ст. і шасцёра дзвярэй XVIII ст. У Троіцкім касцёле захоўваюцца драўляныя дзверы 1669 г. Дзякуючы размешчанаму на іх вялікаму рэлігійнаму тэксту, з’яўляюцца ўнікальнымі для нашай тэрыторыі, а, магчыма, і для значна больш шырокага арэала. Сёння галоўны, бакавыя і сакрыстыйны ўваходы ў гэты храм закрываюць чацвёра драўляных распашных дзвярэй аднога перыяду, пастаўленыя да 1786 г. Тып іх аздаблення, драўляны руст, характэрны для свайго часу і адпавядае патрабаванням надыходзячага класіцызму. Дзверы крыпты Петрапаўлаўскай царквы зроблены адначасова з дзвярыма ў рызніцу і датуюцца 1762 г. Прадстаўляюць рэдкі тып цэльнаметалічных вырабаў. Канструкцыя і аздоба больш характэрная для ранейшых мастацкіх эпох і з’яўляецца працягам барочнага формаўтварэння ў станіслаўскім класіцызме. Усе разгледжаныя ў артыкуле дзверы, акрамя першых, з’яўляюцца прадстаўнікамі не толькі аднога перыяду стварэння (др. пал. XVIII ст.), але і часткай творчай спадчыны выбітнага архітэктара Яна Самуэля Бэкера, і шырэй, яго патронаў князёў Сапегаў, а таксама неад’емным складнікам ружанскага культурнага ландшафту.

ЛІТАРАТУРА

1. Вялікае княства Літоўскае : Энцыклапедыя. У 2 т. Т. 2 : Кадэцкі корпус – Яцкевіч / Рэдкал. : Г. П. Пашкоў (гал. рэд) [і інш. ]. – Мінск : БелЭн, 2006. – 792 с.
2. Акт візітацыі ружанскага касцёла за 1669 г. (Acta Visitationis Generalis In tribus Decanatibus, scilicet in Rozanensi, Volkoviscensi, Slonimensi Eclesiarum Dioecesis Vilnensis…: Ecclesia Rosanensis) // Vilniaus universiteto biblioteka (VUB). – F. 57. B. 53–41. P. 30r–34.
3. Kurczewski, Ks. J. Biskupstwo wileńskie od jego założenia aż do dni obecnych, zawierające dzieje i prace biskupów i duchowieństwa djecezji wileńskiej, oraz wykaz kościołów, klasztorów, szkół i zakładów dobroczynnych i społecznych / Ks. J. Kurczewski. – Wilno : drukiem Józefa Zawadzkiego, 1912. – 614 s.
4. Габрусь, Т. В. Саборы помняць усё : готыка і рэнесанс у сакральным дойлідстве Беларусі. / Т. В. Габрусь – Мінск : Беларусь, 2007. – 166 с.
5. Słownik geograficzny Królestwa Polskiego i innych krajów słowiańskich : w 15 t. / ed.: B. Chlebowski, F. Sulimierski, W. Walewski. – Warszawa : Nakładem Władysława Walewskiego, 1880 – 1902. – T.9 : Pożajście – Ruksze / ed.: B. Chlebowski [i inn.]. – Warszawa : Druk "Wieku" Nowy-Swiat Nr. 61, 1888. – 960 s.
6. Калнін, В. В. Ружанскі Троіцкі Касцёл / В. В. Калнін // Архітэктура Беларусі : Энцыкл. давед. / Беларус. Энцыкл. ; рэдкал.: А. А. Воінаў [і інш.]. – Мінск, 1993. – С. 419–420.
7. Шэстак, Ю. Т. Дзверы з надпісамі XVII ст. у касцеле ў Ружанах / Ю. Т. Шэстак, А. В. Яроменка // Беларускі гістарычны часопіс. – 2019. – № 9. – С. 24–32.

PolotskSU




8. Tajchman, J. Drewniane drzwi zabytkowe na terenie polski (Systematyka i problematyka konserwatorska) / J. Tajchman // Ochrona zabytków. – 1991. – № 4. – S. 269–277.
9. Гісторыя беларускага мастацтва : у 6 т. / рэдкал. : С. В. Марцэлеў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1987–1994. – Т. 2 : Другая палова XVI ст. – канец XVIII ст. / Я. М. Сахута. – 1988. – 384 с.
10. Калнін, В. В. Архітэктура Яна Самуэля Бэкера / В. В. Калнін // Спадчына. – 1998. – № 3. – С. 65–85.
11. Інвентар ружанскага касцёла за 1786 г. (Rozanna…) // Vilniaus universiteto biblioteka (VUB). – F. 57. B. 53–968. P. 1r.
12. Інвентар ружанскага касцёла за 1813 г. (Inwentarz Kościoła y Probostwa Rozanskiego…) // Vilniaus universiteto biblioteka (VUB). – F. 57. B. 53–969. P. 1r.
13. Габрусь, Т. В. Мураваныя харалы : сакральная архітэктура беларускага барока / Т. В. Габрусь. – Мінск : Ураджай, 2001 . – 287 с.
14. Главная церковная и ризничная опись Ружанской Петро-Павловской церкви. 1834 // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродна (БНГА). – Ф. 1143. Воп. 1. Спр. 299. Арк. 1–4.
15. Казадой, С. Гісторыя і дзень сённяшні ружанскага Петра-Паўлаўскага сабора [Электронны рэсурс] / С. Казадой // Часопіс "Праваслаўе". – 2011. – Рэжым доступу: http://sppsobor.by/bractva/vilna/publish/orthodox/4505. – Дата доступу: 11.11.2020.
16. Дело о возобновлении сгоревшей приходской церкви в м. Ружаны Слонимского уезда. 1875–76 // БНГА. – Ф. 97. Воп. 1. Спр. 407. Арк. 1, 3–4.
17. Описания церквей и приходов. Гродненский православно-церковный календарь или Православие в Брестско-Гродненской земле в конце XIX века. Издание 2-е. – Том 1. Епископа Иосифа. . – Воронеж : Типография В. И. Исаева, 1899. – 836 с.
18. Трусов, О. А. Двери и их атрибуты на примере памятников белорусского зодчества / О. А. Трусов // Строительство и архитектура Белоруссии. – 1988. – № 3. – С. 32–36.

PolotskSU

МИНИСТЕРСТВО ОБРАЗОВАНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

УЧРЕЖДЕНИЕ ОБРАЗОВАНИЯ
«ПОЛОЦКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ»

# АКТУАЛЬНЫЕ ПРОБЛЕМЫ АРХИТЕКТУРЫ БЕЛОРУССКОГО ПОДВИНЬЯ И СОПРЕДЕЛЬНЫХ РЕГИОНОВ

Электронный сборник статей

МЕЖДУНАРОДНОЙ
НАУЧНО-ПРАКТИЧЕСКОЙ КОНФЕРЕНЦИИ
(Новополоцк, 26–27 ноября 2020 г.)

Новополоцк
Полоцкий государственный университет
2021

Об издании – 1, 2

PolotskSU

1 – дополнительный экран – сведения об издании

УДК 72(082)

Редакционная коллегия:
Р. М. Платонова (председатель),
В. В. Васильева (отв. секретарь),
Л. М. Парфенова, Е. Д. Лазовский, В. Е. Овсейчик

**АКТУАЛЬНЫЕ ПРОБЛЕМЫ АРХИТЕКТУРЫ БЕЛОРУССКОГО ПОДВИНЬЯ И СОПРЕДЕЛЬНЫХ РЕГИОНОВ** [Электронный ресурс] : электрон. сб. ст. Междунар. науч.-практ. конф., Новополоцк, 26–27 нояб. 2020 г. / Полоц. гос. ун-т ; редкол.: Р. М. Платонова [и др.]. – Новополоцк : Полоц. гос. ун-т, 2021. – 1 электрон. опт. диск (CD-R).

ISBN 978-985-531-734-1.

Представлены итоги исследований, освещающие проблемы истории архитектуры, градостроительства и искусства, современной архитектуры, дизайна и строительства, научно-методические проблемы преподавания архитектурных, дизайнерских и строительных дисциплин.

Предназначен для специалистов в области архитектуры и проектирования, преподавателей, аспирантов, магистрантов и студентов архитектурных, дизайнерских и строительных специальностей.

*Сборник включен в Государственный регистр информационного ресурса.*
*Регистрационное свидетельство № 3671815379 от 26.04.2018.*

211440, ул. Блохина, 29, г. Новополоцк, Беларусь
тел. 8 (0214) 59 95 11, e-mail: r.platonowa@psu.by; u.auseichyk@psu.by

**№ госрегистрации 3671815379.**
**ISBN 978-985-531-734-1** ©Полоцкий государственный университет, 2021

PolotskSU

2 – дополнительный титульный экран – производственно-технические сведения

Для создания текстового электронного издания «Актуальные проблемы архитектуры Белорусского Подвинья и сопредельных регионов» использованы текстовый процессор Microsoft Word и программа Adobe Acrobat XI Pro для создания и просмотра электронных публикаций в формате PDF.

**АКТУАЛЬНЫЕ ПРОБЛЕМЫ**
**АРХИТЕКТУРЫ БЕЛОРУССКОГО ПОДВИНЬЯ**
**И СОПРЕДЕЛЬНЫХ РЕГИОНОВ**

Электронный сборник статей

МЕЖДУНАРОДНОЙ
НАУЧНО-ПРАКТИЧЕСКОЙ КОНФЕРЕНЦИИ
(Новополоцк, 26–27 ноября 2020 г.)

Технический редактор *А. А. Прадидова.*
Компьютерная верстка *А. А. Прадидовой.*
Компьютерный дизайн обложки *Е. А. Балабуевой.*

Подписано к использованию 27.04.2021.
Объем издания: 11,4 Мб. Тираж 3 диска. Заказ 420.

Издатель и полиграфическое исполнение:
учреждение образования «Полоцкий государственный университет».

Свидетельство о государственной регистрации
издателя, изготовителя, распространителя печатных изданий
№ 1/305 от 22.04.2014.

ЛП № 02330/278 от 08.05.2014.

211440, ул. Блохина, 29,
г. Новополоцк,
Тел. 8 (0214) 59-95-41, 59-95-44
http://www.psu.by